РЭПУТАЦЫЯ ЦТ ДАРАГОГА КАШТУЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У тлумачальнай запісцы да дакумента аўтары ініцыятывы напісалі, што сёння выпускнікам, каб атрымаць атэстат, неабходна здаць (на мінімальны бал) усяго толькі два адзіныя дзяржаўныя іспыты — па рускай мове і матэматыцы. Прычым з гэтымі заданнямі ў стане справіцца і паспяховы вучань пятага класа. «Калі ад выпускніка ўстановы сярэдняй агульнай адукацыі дзяржава патрабуе ўзровень ведаў, якім той валодаў у пятым класе, вучыцца становіцца неабавязкова», — падкрэсліваюць народныя абраннікі.

«Ёсць пункты правядзення ЦТ, дзе заўсёды бываюць адхіленыя ад здачы экзамену абітурыенты: і зусім не таму, што ўсе парушальнікі сабраліся менавіта ў гэтай аўдыторыі, а таму, што арганізатары ў аўдыторыі прынцыповыя і адказныя».

У сувязі з гэтым аўтары дакумента прапанавалі вярнуць у якасці выпускнога экзамену школьнае сачыненне, а экзамен па матэматыцы праводзіць у форме кантрольнай работы, якая прадугледжвае некалькі ўзроўняў складанасці. Вяртанне да традыцыйнай атэстацыі, на думку ініцыятараў паправак, павінна быць паэтапным — на працягу некалькіх гадоў, па меры гатоўнасці ўстаноў адукацыі.

Конкурс з прэтэнзіяй

Самае дзіўнае, што ў Беларусі даволі часта гучаць пытанні кшталту «А калі ж, нарэшце, і ў нас аб'яднаюць выпускныя экзамены за курс школы з уступнымі іспытамі ў ВНУ?», пры гэтым аўтары такіх ініцыятыў чамусьці забываюць, што для таго, каб расійскія ВНУ змаглі адабраць больш моцных абітурыентаў, а слабыя вучні маглі атрымаць школьны атэстат, абавязковы адзіны дзяржаўны экзамен па матэматыцы там быў падзелены на два ўзроўні: базавы (для атрымання пасведчання аб сярэдняй адукацыі) і павышаны (для тых, хто прэтэндуе на студэнцкі білет).

— Праблема ў тым, што не толькі абывацелі, журналісты, але і многія педагогі блытаюць цэнтралізаванае тэсціраванне (ЦТ) і выніковую атэстацыю і не бачаць паміж імі прынцыповай розніцы. Мы свядома захавалі на выхадзе са школы выпускныя экзамены ў традыцыйнай форме, каб не заахвочваць муштраванне па тэстах, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — А задача ЦТ — складанне рэйтынгавых спісаў абітурыентаў у адпаведнасці з узроўнем іх падрыхтоўкі. Гэта фактычна конкурс сярод абітурыентаў з прэтэнзіяй на пэўнае месца, пажадана больш высокае, у агульным спісе прэтэндэнтаў. І пакуль гэта ўсе не зразумеюць, так і будуць думаць, што 30 балаў на ЦТ — гэта школьная «тройка», а 20 балаў — «двойка».

Мэта цэнтралізаванага тэсціравання — правесці конкурсны адбор. На ЦТ у аснову методыкі разліку тэставага была пакладзена стабальная шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і ўлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання. Пагадзіцеся, што ў школе складана выправіць «дзявятку» на «дзясятку», а вось дабраць хоць некалькі дадатковых пунктаў пры 100-бальнай сістэме — мэта, якая прымушае абітурыентаў працаваць.

Дарэчы, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў на пастаяннай аснове кантактуе з некаторымі ВНУ для супастаўлення школьных атэстатаў, вынікаў ЦТ і экзаменацыйнай сесіі. «Наша ацэнка ведаў маладых людзей на ЦТ і ацэнка іх ведаў падчас сесіі ў ВНУ, як правіла, супадаюць, — падкрэслівае Мікалай Фяськоў. — Уладальнікі высокіх балаў без праблем адаптуюцца да патрабаванняў вышэйшай школы. А вось у тых, хто з вялікімі цяжкасцямі пераадолеў мінімальны парог, часцей за ўсё ў працэсе навучання ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы. Што тычыцца школьных атэстатаў, то школьныя адзнакі карэлююць з паспяховасцю студэнтаў у меншай ступені. Яно і зразумела, бо школьны бал — гэта ацэнка настаўнікам ведаў школьніка, якая пры гэтым выконвае і ролю стымулу ў навучанні, таму часта завышаецца».

Металадэтэктары не панацэя

У апошнія гады колькасць абітурыентаў, адхіленых ад удзелу ў ЦТ па прычыне парушэння ўстаноўленых правілаў, у нашай краіне змяншалася. З чым гэта звязана?

— З пункту гледжання захавання канфідэнцыяльнасці тэставых матэрыялаў беларуская сістэма мае значную перавагу перад аналагічнымі тэхналогіямі ў іншых краінах і, акрамя таго, яна дазваляе больш рацыянальна выкарыстоўваць фінансавыя сродкі. Устаноўка металадэтэктараў, безумоўна, добры сродак для кантролю за тым, што абітурыенты праносяць у аўдыторыі, аднак ён вымагае істотных матэрыяльных укладанняў і ўсё роўна не дае стапрацэнтнай гарантыі, — дзеліцца сваімі думкамі Мікалай Фяськоў. — Мы даўно пераканаліся, што самы дзейсны спосаб папярэдзіць магчымыя парушэнні ў аўдыторыі — гэта няўхільна выконваць усе нормы «Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання». Паверце, што кожны радок, кожная ўнесеная ў гэты дакумент карэкціроўка і дапаўненне з'явіліся там у выніку нашай шматгадовай практыкі правядзення цэнтралізаваных іспытаў. І для таго, каб не дапусціць уцечкі зместу тэстаў з экзаменацыйнай аўдыторыі, дастаткова, каб у аўдыторыі прысутнічалі адказныя арганізатары. У нас ёсць пункты правядзення ЦТ, дзе заўсёды бываюць адхіленыя ад здачы экзамену абітурыенты: і зусім не таму, што ўсе парушальнікі сабраліся менавіта ў гэтай аўдыторыі, а таму, што арганізатары ў аўдыторыі прынцыповыя і адказныя. Праносіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыях, дзе праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне, любыя прадметы, акрамя пашпарта, пропуска і ручкі з чарнілам чорнага колеру, забараняецца. З'яўленне любога іншага прадмета на стале — падстава для адхілення ад здачы экзамену. Абітурыенты, спадзяюся, гэта зразумелі, таму і не рызыкуюць.

«Прызнаюся, што заваяваць давер да ЦТ з боку абітурыентаў, іх бацькоў, педагагічнай грамадскасці было вельмі няпроста. Таму мы вельмі даражым сваёй рэпутацыяй, — падкрэслівае Мікалай Фяськоў. — Магчыма, не ўсе абітурыенты ведаюць, што падчас тэсціравання іх размеркаванне па аўдыторыях праводзіцца з дапамогай камп'ютарнай праграмы. Мы маем магчымасць штогод змяняць крытэрыі, па якіх вызначаецца аўдыторыя для кожнага абітурыента. Таму забраніраваць сабе месца загадзя ў апошнім радзе канкрэтнай аўдыторыі праз знаёмага арганізатара не атрымаецца. А вось на якім месцы і ў якой аўдыторыі сядзіць кожны з 78 тысяч абітурыентаў на тэсціраванні па рускай мове, мы ведаем дзякуючы нашай камп'ютарнай сістэме».

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Спецыяльнае праграмнае забеспячэнне захоўвае інфармацыю аб кожным бланку адказаў, які дасылаецца ў пункты тэсціравання. Таму арганізатары ЦТ маюць магчымасць імгненна вызначыць месца яго знаходжання (корпус пункта тэсціравання і аўдыторыю). Такая тэхналогія суправаджэння бланкаў выключае магчымасць злоўжыванняў і непасрэдна пры правядзенні іспытаў.

За час існавання інстытута быў створаны ўнікальны банк тэставых заданняў. Поўны цыкл падрыхтоўкі заданняў, ад заключэння адпаведнага працоўнага пагаднення паміж інстытутам і аўтарскім калектывам да перамяшчэння іх у базу, складае паўтара-два гады.

— Хачу звярнуць увагу на тое, што тэставыя заданні пры поўным захаванні патрабаванняў вучэбных праграм не з'яўляюцца нейкай копіяй звычайных пытанняў ці задач на замацаванне вучэбнага матэрыялу па пройдзенай тэме. Гэта арыгінальныя і эксклюзіўныя, кароткія па змесце заданні з графічна выверанымі формуламі, схемамі і малюнкамі. Да заданняў абавязкова дадаюцца чатыры-пяць праўдападобных адказаў, прадстаўленых у адным стылі — так званых дыстрактараў. У інстытуце распрацаваны звод правілаў па інфармацыйнай бяспецы для асоб, якія маюць непасрэднае дачыненне да тэставых матэрыялаў.

Усе заданні пасля праходжання шматразовай экспертызы размяшчаюцца ў банку на асобнай партатыўнай рабочай станцыі, абароненай крыптаграфічнымі сродкамі. З гэтага часу з заданнямі базы, пасля выканання пэўных рэгламентаваных працэдур, можа працаваць толькі профільны спецыяліст.

Амаль усе працэсы, якія характарызуюцца аднатыпнасцю, аўтаматызаваны, што не толькі паскарае час падрыхтоўкі і апрацоўкі тэставых матэрыялаў, але і павышае інфармацыйную бяспеку, паколькі адсутнічае так званая «ручная» праверка.

Вашы хітрыкі нам вядомыя!

— Кожны год пасля тэсціравання мы дыягнастуем «вузкія» месцы нашага праграмнага забеспячэння, каб у час падрыхтоўкі да наступных іспытаў зрабіць яго больш пластычным, — канстатуе Мікалай Фяськоў. — Прызнаюся, што супрацоўнікі інстытута пастаянна адсочваюць правядзенне ўступных выпрабаванняў у іншых краінах як на прадмет іх арганізацыі, так і на прадмет выяўлення «слабых месцаў». Лепш вучыцца на чужых памылках, чым на сваіх. Тым, як супрацьстаяць выкарыстанню тэхнічных сродкаў на экзаменах, заклапочаны абсалютна ўсе краіны. Шпаргалкі на каленях — гэта ўжо ўчарашні дзень. Тэхнічны прагрэс на месцы не стаіць, і нават звычайныя, на першы погляд, упрыгажэнні могуць служыць прыёмнай антэнай, а ў гадзінніку на руцэ можа хавацца прыстасаванне для захоўвання шпаргалак. Але мы ведаем пра ўсе гэтыя хітрыкі. І пра мікра- і нананавушнікі таксама ведаем. Вось чаму галаўныя ўборы ў экзаменацыйнай аўдыторыі зусім не вітаюцца. Хоць цяжка ўявіць сабе, што абітурыент можа з экзаменацыйнай аўдыторыі прадыктаваць умовы задачы і дачакацца адказу.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Падпіска-2016

БУДЗЕМ ЧАСЦЕЙ БАЧЫЦЦА!

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Звяздоўскі фармат зносін са сваімі чытачамі мяркуе зацікаўлены ўдзел у коле жыццёвых праблем тых людзей, якія штодня, спадзяёмся, з цікавасцю разгортваюць нашу газету. Падчас цёплых сустрэч з падпісчыкамі мы ўжо ўзялі «на аловак» шэраг тэм, якія ў далейшым будуць распрацаваны на старонках «Звязды». І колькі яшчэ, думаем, іх з'явіцца ў журналісцкім нататніку.

Геаграфія правядзення сустрэч з чытачамі даволі ўнушальная. Мяркуйце самі, за два тыдні мы пабывалі ў дзесяці раёнах усіх шасці абласцей — завіталі ў Маладзечна, Шуміліна, Слаўгарад, Валожын, Бярозу, Дзятлава, Івацэвічы, Гродна, Добруш, Дрыбін. І працягваем ладзіць сустрэчы. Напрыклад, **сёння накіроўваемся на Гродзеншчыну і Магілёўшчыну — у Смаргонь і Кіраўск. Дзень падпісчыка 8 чэрвеня пройдзе ў гэтых адметных гарадах у аднолькавы час — з 11 да 14 гадзін — на раённых вузлах паштовай сувязі. Прыходзьце — варта часцей бачыцца!**

ГРОШЫ КАПАЛІ З-ПАД КРАНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Летась мужчына пачаў звяртацца ў розныя інстанцыі, каб яму адрэгулявалі сістэму з гарачай вадой. Толькі за гэты год у яго кватэры пабывала некалькі камісій. Спачатку на сігнал адрэагавала прадпрыемства цеплаэнергетыкі. Прыйшлі спецыялісты, замералі тэмпературу і ў акце чорным па белым напісалі: трэба зліць 6 літраў вады, пакуль яна набярэ неабходныя 50 градусаў. Факт ёсць факт. Але праблема засталася нявырашанай.

Шэсць літраў выліваецца ў каналізацыю, а хто павінен за іх плаціць? З гэтым зусім не рытарычным пытаннем мужчына звярнуўся ўжо ў адміністрацыю Кастрычніцкага раёна на «прамую лінію». Прыйшла яшчэ адна камісія, прыкладна ў тым жа складзе — прадстаўнік ЖЭУ, цеплаэнергетыкі і Кастрычніцкага ЖРЭУ. Намералі ўжо 4,5 літра. Але воз, як той казаў, і сёння там.

Наш герой зусім быў апусціў рукі, але пачуў па тэлевізары, што на гэты конт думае Прэзідэнт. Падчас візіту на «Камунарку» кіраўнік дзяржавы якраз акцэнтаваў увагу на неабходнасці эканоміць рэсурсы — як у краіне ў цэлым, так і ў кожнай кватэры асобна.

Пенсіянер зноў пайшоў да камунальнікаў. Хай перанясуць гэтую злашчасную разводку і назаўжды пазбавяць яго неабходнасці плаціць за тое, чым ён не карыстаецца. А ў звароце на імя старшыні гарвыканкама напісаў пра ўсё, што набалела. Маўляў, плачу спраўна па «лічыльніках», але не па сваёй віне павінен зліваць вялікую колькасць халоднай вады, якая цячэ з гарачага крана. Адначасова губляю грошы на халоднай вадзе і каналізацыі, бо тут усё ўзаемазвязана. Споведзь атрымалася на некалькіх лістах, з матэматычнымі разлікамі. 6 літраў у нікуды — гэта ж за раз, але вада патрабуецца часцей, чым раз на дзень. Праз гадзіну кран адкрываеш, а труба зноў астыла. У выніку як мінімум метр кубічны вады за месяц ідзе невядома куды.

— Праблема гэта не толькі мая, але і ўсіх тых, хто апынуўся ў маёй сітуацыі, — заклапочаны Васіль Паўлавіч. — У нашым доме 6 пад'ездаў, на кожнай пляцоўцы 4 кватэры, атрымліваецца 24. Гэта значыць, што 24 кубы псеўдагарачай вады выкарыстоўваецца нерацыянальна. А колькі такіх дзявятых паверхаў па горадзе? А па краіне? Дзяржава гэтую ваду з-пад зямлі дастае помпамі, падгравае, яшчэ і датацыю дае, а нас прымушаюць яе зліваць. Навошта? Я звяртаю ўвагу на тое, што трэба каштоўны рэсурс зберагчы, а мяне адсылаюць куды падалей адкрытым тэкстам.

У афіцыйных адказах настойліваму скаржніку патлумачылі: разводка зроблена ўверсе для разпаветрывання сістэмы, так, маўляў, прадугледжана праектам. Васіль Паўлавіч не разумее, чаму за гэта павінны разлічвацца асобныя жыхары? Да таго ж ён лічыць, што спасылкі на праект — гэта проста зручная пазіцыя нічога не рабіць. Некалькі гадоў таму мясцовы сантэхнік прапаноўваў яму паслугі па пераносе разводкі ў прыватным парадку. Сказаў, што гэтая справа выедзенага яйка не вартая. Ніхто, запэўніваў, не ўбачыць. «Я вырашыў ісці законным шляхам: трубы ж не мае, яны знаходзяцца на балансе ЖЭУ, — сведчыць суразмоўца. — А сутыкнуўся з такой бюракратыяй. Камунальнікі самі нічога не робяць, а іншыя іх безгаспадарчасць падтрымліваюць. Куды ні звяртаўся, а правершчыкі адны і тыя ж — прадстаўнікі роднага ЖЭУ, ЖРЭУ, цеплаэнергетыкі. Яшчэ і смяюцца: ды ты хоць міністру пішы, усё роўна мы прыйдзем і адказ будзем даваць. Так яно і ёсць. Тэкст у лістах з розных інстанцый як пад кальку напісаны». Асабліва пакрыўдзіла магіляўчаніна фраза ў афіцыйных адказах: нарматыў на зліў вады ў дзяржаве не ўстаноўлены. Інакш як здзекам гэта не назавеш. Іншымі словамі, зліваў, спажывец, ваду, колькі жадаеш, а якой якасці наша паслуга, нікога не турбуе.

Дзяржава гэтую ваду з-пад зямлі дастае помпамі, падгравае, яшчэ і датацыю дае, а нас прымушаюць яе зліваць. Навошта?



Леоненко В.П.
пр. Пушкинский, 17А-107
г.Могилев

Администрация Октябрьского района г. Могилева, в дополнение к ранее данному ответу на Ваше обращение, сообщает, что перерасчет за недопоставку услуг по уборке вспомогательных мест жильцам 3-его подъезда дома 17а по пр. Пушкинскому, произведен.

Одновременно информируем, что после предоставления доступа, на момент обследования, произведенного 16.03.2016, при сливе 4, 5 л воды температура горячего водоснабжения в Вашей квартиры соответствует установленным социальным стандартам, норматива на слив нет. Система горячего водоснабжения квартиры находится в технически-исправном состоянии, в квартире разводка горячего водоснабжения врезана в верхнюю точку стояка ГВС для обеспечения развоздушивания системы согласно проектно-сметной документации.

Заместитель главы администрации С.А. Орешков

Неверко
Евдокимова 48 13 15

Усе запыты магіляўчаніна пакуль не даюць адказу на яго пытанне: чаму ён павінен за гэта плаціць?

Васіль Лявоненка лічыць, што такую праблему, як гэта, трэба вырашаць на ўзроўні не толькі аднаго горада, а вышэй.

— Дом пабудавалі ў 1979 годзе, але ж на вуліцы ўжо нават другое стагоддзе. Трэба мяняць нешта. Навошта мяне і іншых людзей, якія апынуліся ў такім стане, прымушаць плаціць за тое, чым мы не карыстаемся?

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

■ Сорам

ПАЛЯВАННЕ НА ПРЫГАЖОСЦЬ

Магілёўскія камунальнікі б'юць трывогу: кветкі, якімі яны ўпрыгожваюць горад, карыстаюцца вялікім попытам у... зладзеяў. Работнікі «Магілёўзелянбуда» не паспяваюць іх высаджваць. Прычым апетыты паляўнічых на прыгажосць не абмяжоўваюцца адным букецікам.

— 11 мая з раздзяляльнай паласы па праспекце Касманаўтаў знікла кашпо, двойчы такая ж гісторыя паўтарылася на бульвары Непакораных, — абураецца начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела «Магілёўзелянбуда» Святлана Банкузава. — А ў панядзелак мы даведаліся, што нейкія вар'яты скінулі 12 вазонаў з петуніямі ў раку Дубравенка прама ў зоне адпачынку. Мы панеслі страты на 2 мільёны рублёў. Камунальнікі кажуць, што па розных фактах крадзяжоў кветак напісалі ў міліцыю ўжо 6 заяў. Але зладзеі пакуль не трапляліся праваахоўнікам на вочы. Адна кветка без уліку працы каштуе 14 тысяч рублёў. За 4 дні ў Магілёве скралі 160 штук. Асаблівым попытам карыстаюцца петуніі, але зламыснікі не грэбуюць і бегоніямі, тагецісамі, агератумамі, сальвіямі, ільвіным зевам.

— Людзі наогул страцілі сумленне, — кажа Святлана Мікалаеўна. — Крадуць нават з мемарыялаў. У пачатку мая з кветніка ахвярам Лупалаўскага канцлагера ваенна-палонных на праспекце Шміта зніклі цюльпаны, прычым нават з цыбулінамі. Той, хто рабіў гэтую справу, напэўна не ведаў, што ад цыбуліны, якая яшчэ не адцвіла, няма ніякага толку. Гэтыя цюльпаны больш ніколі не зацвітуць.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ На свае вочы



«Пенсіянеры выкладваюць свае кроўныя за прадукты, а ён іх проста бярэ ў крамах паесці»

Карэспандэнт «Звязды» пабываў на выязным судовым пасяджэнні над праграмістам, які ператварыўся ў... жабрака

Жыццё Андрэя пайшло пад адхон. Раней быў запатрабаваным праграмістам. Дзесяць гадоў пражыў у ЗША, напэўна, чакаў ажыццяўлення амерыканскай мары... А цяпер ператварыўся ў хворага на пнеўманію жабрака, у якога ўсё адбіваецца на бледным твары, прыкрытым марлевай павязкай.

«Мяне крыху «пераклініла»

Падобныя пасяджэнні па-за межамі судоў у Беларусі нярэдкасць і праходзяць па ўсёй краіне. Так, напрыклад, у Бабруйску ў прысутнасці навучэнцаў аграрна-эканамічнага каледжа за выраб, захоўванне і ўжыванне наркотыкаў судзілі трох хлопцаў. А ў актавай зале Фрунзенскага раёна сталіцы — 16-гадовага распаўсюдніка спайсаў. Расчуленая маці наркагандляра тажы нават стала перад суддзёй на калені, каб памілавалі яе дзіця. Але такая эмацыйнасць і заступніцтва ўсё роўна не дапамаглі: хлопца тады адправілі на адзін год у лячэбна-выхаваўчую ўстанову закрытага тыпу.

Такіх эмоцый на судзе над праграмістам не было. У зале наогул стаяла цішыня, якую толькі аднойчы прарэзаў званок мабільнага тэлефона. Але наўрад ці гэта абумоўлена акалічнасцямі справы, якую тым часам разбіралі... Абвінавачаны — мужчына, неаднойчы судзімы. Ён чарговы раз не стрымаўся і парушыў устаноўленыя ў дачыненні да яго абмежаванні прэвентыўнага нагляду. Выпіваў, пастаяннага месца пражывання не меў і зноў апынуўся за кратамі.

— Вам ставяць у віну змену месца жыхарства ў межах Мінска без паведамлення органаў унутраных спраў. Гэта так? — спытаў у падсуднага абвінаваўца.

— Так, безумоўна.

— Што вам магло перашкодзіць гэта зрабіць?

— Я думаў, што сказаў. А можа, і не паведамляў. Відаць, мяне крыху «пераклініла».

Праз пэўны час абвінаваўца дадаў:

— Хацелася б звярнуць увагу суда пры вызначэнні пакарання абвінавачванаму, наколькі спакойна і вытрымана ён расказвае пра тое, што ў краме можна скрасці нешта паесці, што можна распіваць спіртныя напоі ў грамадскіх месцах. Шматдзетныя сем'і, пенсіянеры, лічаць свае крыхі, якія зарабляюць. Яны ідуць і набываюць прадукты ў краме, а ён прыходзіць і проста так іх бярэ паесці. Гэта ў поўнай меры характарызуе яго як антысацыяльную асобу, якая цалкам ігнаруе агульнае жыццё ў грамадстве і абмежаванні, устаноўленыя для яе правасуддзем. Ён больш за 20 разоў прыцягваўся да адказнасці: дробнае хуліганства і крадзеж, распіццё алкагольных напояў у грамадскіх месцах, парушэнне правілаў прэвентыўнага нагляду... Лічу, што абставінаў, якія б змякчалі адказнасць абвінавачванага, няма. І гэта нягледзячы на тое, што ён фармальна прызнае віну.

Абвінаваўца прасіў два гады для падсуднага. У выніку, у дзень свайго нараджэння, ён атрымаў год і шэсць месяцаў калоніі строгага рэжыму.

«Магчыма, прысутныя паслухалі і зробяць правільны выбар»

— Падсудны — чалавек, які мае дзве вышэйшыя адукацыі, але аднойчы збіў сваю сужыцельку і апынуўся ў турме. Пасля вызвалення стаяў у нас на ўліку. Свайго жылля не мае і фактычна з'яўляецца жабраком, — тлумачыць судовыя перыпетыі **Валерый ЯРОШКА, начальнік крымінальна-выканаўчай інспекцыі Партызанскага РУУС сталіцы.** — Ён неаднаразова парушаў закон. Яму не раз дапамагалі, але чалавек злоўжывае спіртным. З-за гэтага ўсе ягоныя праблемы. І ён зноў і зноў трапляе ў месцы пазбаўлення волі.

— Дарэчы, як часта ў вашым упраўленні праводзяць выязныя суды?

— Ужо даўно. Але мы ўпершыню правялі пасяджэнне, звязанае з парушэннем прэвентыўнага нагляду. Арганізавалі яго для выхаваўчага ўздзеяння на людзей. Гэтым хацелі паказаць, што за невыкананне абмежаванняў можна атрымаць рэальны тэрмін. Дзеля гэтага і запрасілі так шмат людзей. Сярод іх было багата тых, хто сядзеў за кратамі. Магчыма, у кагосьці патрэбная інфармацыя адклалася ў галаве і ён зробіць правільны выбар.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*